несур'ёзна пра сур'ёзнае

Уладзімір Цанунін

# ЛЮСТЭРКА

Вершаваныя анекдоты
і гумарыстычныя вершы

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2017

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Беи)-5
Ц16

*Серыя заснавана ў 2014 годзе*

Рэдакцыйны савет:
*М. В. Шабовіч, А. М. Зэкаў, К. В. Камейша,*
*Л. Ф. Анцух, В. А. Губараў, А. В. Кубышкіна*

**Цанунін, У. Я.**
Ц16 Люстэрка : вершаваныя анекдоты і гумарыстычныя вершы / Уладзімір Цанунін. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2017. — 120 с. : іл. — (Несур'ёзна пра сур'ёзнае).
ISBN 978-985-581-064-4.

З камічнымі сітуацыямі мы сустракаемся амаль кожны дзень у нашым жыцці. Шмат хто нават у сур'ёзным можа ўбачыць смешнае. Гэта тыя, каму ад прыроды ўласціва пачуццё гумару. Няма сярод беларусаў, бадай, ніводнага чалавека, які б з задавальненнем не слухаў анекдоты.

Усё тое, што ёсць у гэтай кніжцы, было пачута аўтарам у розных кутках нашай Беларусі. Ён вырашыў данесці да чытача бліскучы беларускі гумар у вершаванай форме.

**УДК 821.161.3-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-581-064-4**

© Цанунін У. Я., 2017
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва "Чатыры чвэрці"», 2017

# Не шпрыцом выціснута

***

«Доктар! Ваш не спраўдзіўся прагноз,
Што праз тыдзень-два мяне не стане,
Бо паўгода з тых часоў прайшло —
Я жывы, здаровы, як спартанец.

Што гэта: памылка альбо здзек?..» —
Доктар прызадумаўся на хвілю,
А пасля сказаў, нібы адсек:
«Значыць, вас няправільна лячылі!»

***

Ад холаду і стомы
(Зусім не важна, дзе)
Тапіўся ўрач вядомы,
Канешне ж, у вадзе.



Яго за чуб кароткі,
Падалей ад бяды,
Хлапчына хутка ў лодку
Дастаў рукой з вады.

Захутаўшыся ў полаг
І выпіўшы вінца,
Удзячны стаматолаг
Звярнуўся да хлапца:

— За тое, што ад згубы
Пазбавіў, дарагі,
Табе я вырву зубы...
І нават без чаргі!

***

Мне крышку сорамна, але
Я мушу расказаць пра гэта.
Ў аперацыйнай на стале
Ляжыць афіцыянт раздзеты.

Над ім схіліўся нізка ўрач,
Пакратаў месца пухлых болек
І ціха прашаптаў: «Прабач,
Не абслугоўваецца столік».

***

Такое толькі ў страшным сне прысніцца
І будзе доўга мучыць праз гады.
Панёс аналіз ранкам у бальніцу
У скрынцы ад запалак, як заўжды.

Ішоў таропка, часу не хапала.
Увагу думкі адагналі ўбок.
Мужчына нейкі папрасіў запалак.
Я даў яму з кішэні карабок.

Усё, што потым, памятаю слаба.
Адно імгненне толькі не забыў,
Калі далі мне кулаком у скабы —
Ледзь зубы ўсе ў імгненне не згубіў.

***

У бальніцы глядзелі псіхі
Тэлевізар камандай цэлай.
Зала цёмнай была і ціхай.
Аднаму толькі ўсё карцела.

Хто б ні выступіў на экране
Ці з'явіўся на кінастужцы,
Псіх выкрыквае: «Эх, славяне!
Вельмі добра, што я ў псіхушцы!»

Два ўрачы пазіралі ззаду,
І адзін з іх сказаў сурова:
«Заўтра выпішу гэтага гада.
Ён, здаецца, зусім здаровы».

***

Прыйшла ў бальніцу ранкам бабка Каця
Шукаць ратунку ад хвароб і бед.
У кабінеце доктар у халаце
Яе ўсе скаргі выслухаў як след,

А потым мовіў: «Вам не трэба мазі,
Гарчычнікі і шклянкі па спіне.
Я выпішу квіток, каб Вы на гразі
Хадзілі раз у тыдзень да мяне».

Схіліўся потым моўчкі над паперай
І стаў запісваць нешта пакрысе...
«А ад хвароб, няхай на іх халера,
Гразь гэта мне збавенне прынясе?» —

Спытала спрытна ў доктара старая.
Той нібы адрэзаў ёй: «Баб Каць!
Не ведаю, але сур’ёзна раю,
Пара ўжо да зямелькі прывыкаць».

***

Даўно разумею сам:
Склероз — гэта памяць клінам.
Аднак на душы бальзам,
Бо кожны дзянёк — навіны!

***

Я хворых падзяліў на два разрады.
Іх колькі па бальніцах ні лячы,
Адны любым пілюлям вечна рады,
Другім заўсёды кепскія харчы.

***

Мужчын псуюць заўсёды грошы.
Ёсць у народа меркаванне:
Жанчына здыме гэту ношу
І хутка злечыць ад псавання.

***

Сказала жонка мужу каля брамы:
«Мой доктар пасля доўгага агляду
Параіў мне Канары і Багамы.
Чаму ты гэтай навіне не рады?

Я нават пахвалілася суседзям,
Што будзе рамантычнаю дарога.
Куды ж, скажы, з табою мы паедзем?»
Муж буркнуў: «Да прафесара другога».

***

Як лепш валоссе захаваць,
Каб быць прыгожым, жыць у шчасці?
Спачатку трэба іх сабраць,
А потым у скарбонку скласці.

## Лёгкая аперацыя

Зайшоў у палату
Да доктара ўранні
Хлапец зухаваты
З адзіным пытаннем:

«Мазоль мне адрэзаць
Прашу неадкладна,
Бо пальцы не лезуць
У бот мой парадны».

Прафесар з ланцэтам
Пагрозліва кінуў:
«Кладзіся. Я гэта
Зраблю за хвіліну».

# Пра аўтара



Уладзімір Яфімавіч Цанунін нарадзіўся 1 ліпеня 1954 года ў в. Батвінаўцы Крычаўскага раёна Магілёўскай вобласці. У 1975 г. пасля заканчэння гістфака Магілёўскага дзяржаўнага педінстытута настаўнічаў у вёсцы Святая Воля Івацэвічскага раёна. Праз год вярнуўся на малую радзіму, працаваў у Чавускім раёне, затым — у Крычаўскім вучылішчы міліярацыі, у 1980-я гг. пераехаў у родную вёску, дзе жыў да аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Потым як перасяленец жыў у в. Папялёве на Пружаншчыне.

У 1995 г. па выніках конкурсу запрошаны ў беларуска-германскае дабрачыннае прадпрыемства «Надзея — XXI стагоддзе», створанае для аздараўлення дзяцей-чарнобыльцаў. Працаваў настаўнікам гісторыі і кіраўніком гуртка «Работа з дрэвам».

Вершы і песні пачаў пісаць у пачатковай школе. Упершыню надрукаваўся ў 1967 г. у часопісе «Бярозка».

З 2002 г. — член Народнага клуба самадзейных паэтаў і кампазітараў «Жывіца».

Член вілейскага літаб'яднання «Натхненне». Уваходзіць у Народны калектыў аўтарскай песні «Элегія», які з'яўляецца лаўрэатам нацыянальных і міжнародных фестываляў. Разам з калектывам запісана каля дзесяці дыскаў. Пасля перамогі на фестывалі польскай нацыянальнай культуры ў г. Маладзечне

разам з удзельнікамі «Элегіі» ў 2009 г. быў прыняты ў Беларускі саюз музычных дзеячаў.

У 2010 г. напісаны У. Цануніным вершаваны тэкст да фільма «Горад на Вяллі» заняў першае месца на конкурсе дакументальнага кіно.

З 2014 г. — член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Мае паэтычныя зборнікі: «У струменях часу», «Хто ж адкажа», «Пушчанскія галасы», «Да вогнішча далёкага юнацтва»; аўтар шматлікіх калектыўных зборнікаў: «Край верасовы», Народнага клуба самадзейных паэтаў і кампазітараў «Жывіца», вілейскага літаб'яднання «Натхненне».

Жыве ў г. Вілейцы.

# ЗМЕСТ

НЕ ШПРЫЦОМ ВЫЦІСНУТА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
ДУМКІ Ў ЗАДВОРКУ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11
У ТЛУМЕ ДЗЁН . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 29
КАЗКІ НА НОВЫ ЛАД . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 42
П'ЯНЫЯ ВЫБРЫКІ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 57
ШКОЛЬНЫЯ ЗАМАЛЁЎКІ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 70
ПРА ЛЮДЗЕЙ У ПАГОНАХ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 82
БАЙКІ НА ПРЫРОДЗЕ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 85
ЦЕШЧАМ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 93
ВЕЧНАЯ ТЭМА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97

Пра аўтара . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 117